Гарадская грамадска-палітычная газета

Бабруйскае жыццё

Выдаецца з лістапада 1918 года

№77 (15981) АЎТОРАК, 23 мая 2000 года. Цана 25 руб.

ПРОШЕЛ ДЕНЬ ИНФОРМИРОВАНИЯ

В четверг на прошлой неделе прошел очередной день информирования.

В Бобруйском горисполкоме перед представителями исполнительной власти города, руководителями предприятий и их заместителями, активом БПСМ выступил помощник Президента Республики Беларусь Сергей Посохов.

В своем выступлении он рассказал о положении дел в экономике нашей республики. Особое внимание уделил сложившимся на настоящее время взаимоотношениям между Россией и Беларусью.

В ходе разговора на эту тему прозвучало, что детальный анализ выполнения Договора о создании союзного государства был сделан Президентом А. Г. Лукашенко в его выступлении на недавно состоявшейся пятнадцатой сессии парламентского собрания двух стран. Реалии сегодняшнего дня таковы, что в последнее время с российской стороны по отношению к Беларуси проводится политика, не способствующая интеграционному процессу.

Помощник главы государства также высказался о деятельности оппозиции внутри республики и за ее пределами. Отметил, что руководство Беларуси выполнило обязательства, взятые перед ОБСЕ, выступив инициатором создания широкого общественного диалога с участием всех заинтересованных сторон.

В своём докладе Сергей Посохов затронул ряд других вопросов общественно-политического характера.

М. МИХАЙЛОВ.

НА УЧЕНИЯХ – В НОВОЙ ДОЛЖНОСТИ

Под руководством начальника Главного штаба Вооруженных Сил Республики Беларусь генерал-лейтенанта Михаила Козлова с управлением 5-го гвардейского армейского корпуса в эти дни проводятся командно-штабные учения.

В новой должности принимает участие в учениях начальник Бобруйского гарнизона генерал-лейтенант Владимир Усхопчик: Указом Президента Республики Беларусь от 19 мая Владимир Никитович назначен на должность заместителя министра обороны. Поэтому в ходе отработки вопросов КШУ ему отведена роль помощника руководителя учений. Решение же за командира корпуса при отработке тактических задач поручено принять начальнику штаба 5-го гвардейского АК генерал-майору Валерию Боровому.

Виктор ФИЛОНОВ.





АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

Так ужо склалася жыццё наша невясёлае, што даўно зніклі з яго былыя агляды мастацкай самадзейнасці. Сямтам па ініцыятыве энтузіястаў яны калі-небудзь праводзяцца, але ў раённым і тым больш гарадскім маштабах – не.

Адміністрацыя Ленінскага раёна і, у прыватнасці, яе аддзел па культуры вырашылі парушыць гэтую вымушаную традыцыю і правесці агляд-конкурс "Юныя таленты". Яго адметнай рысай стаў удзел не толькі дзіцячых калектываў дамоў культуры і школ з мастацкім ухілам, няшкольных дзіцячых устаноў, падлеткавых клубаў пры жыллёва-эксплуатацыйных участках, але і дзіцячых садкоў. Такое практыкуецца ўпершыню.

А ў мінулую пятніцу ў памяшканні тэатра драмы і камедыі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча прайшоў заключны канцэрт агляду. Да яго пачатку прыйшоўшыя сюды бабруйчане здолелі агледзець разгорнутую ў верхнім фае тэатра выставу выяўленчай і тэхнічнай творчасці рабят. Трэба сказаць, што яна ўражвала.

Канцэрт, што доўжыўся больш трох гадзін, з якіх палова часу была аддазена творчасці выхаванцаў дзіцячых садкоў і дзіцячага дома № 1 для малодшых рабят. Трэба было бачыць, якой радасцю свяціліся вочы ў маленькіх артыстаў, з якой непасрэднасцю, шчырасцю яны ўпершыню выступалі не ў сябе на ранішніку, а на сапраўднай, вялікай сцэне. Гэта стала святам для дзяцей. І дзеля аднаго гэтага варта было палавіну праграмы аддаць малым. А якая вялікая праца выхавальнікаў і педагогаў прагледжвалася за тым, што паказала самая малодшая дзятва! Люба-дарага было паглядзець на маляўнічыя, з густам выраблены касцюмы юных танцораў і спевакоў, гімнастаў. На іх старанне...

Асабліва шмат нумароў прадставіў дзіцячы дом № 1. Гэта і танцы "Сланечнікі", "Каўбоі", і ансамбль шумавых інструментаў, спартыўны нумар. Выхаванцы садка № 49 станцавалі "Перапёлачку", а садка № 2 – рытмічны танец і практыкаванні са стужкамі, прычым выступілі са сваёй салісткай Ксюшай Гаўрыленка. Юныя артысты садка № 1 паказалі практыкаванні са скакалкамі, садка № 5 – танец "Дзьмухавец".

Найбольшую колькасць самадзейных калектываў прадставіў Дом культуры акцыянернага таварыства "ФанДОК", прычым значная частка іх адзначана дыпломамі. Так, вельмі прыемнае ўражанне пакінулі фальклорны калектыў "Кузьня", танцавальны калектыў "Вяснушкі", салісты ўзорнай вакальнай студыі "Сажынцы" Надзея Паповіч – удзельніца розных конкурсаў і фестываляў, у тым ліку тэлевізійных, і Ірына Міранькова, арыгінальная па задуме жартоўная кампазіцыя "Сустрэча" у выкананні студыі сучаснага танца "Грацыя" і паказальныя выступленні адзінага ў нашым горадзе дзіцячага клуба каратэ-до "Танрэм". А ў гэтым жа Доме культуры ёсць яшчэ і тэатр лялек "Батлейка", і цыркавая і шахматная студыі.

Засталося ў памяці выступленне ўзорнага фальклорнага калектыву "Бярэзіца" і непрымусовае спяванне маленькага саліста Дзяніса Чартова з Дома культуры акцыянернага таварыства "Сілікат".

Лаўрэатамі конкурсу па праву сталі ўзорны хор "Крынічка" школы № 6 з музычна-харавым ухілам і яе вучань, саліст Дзіма Шыла, які пакарыў публіку сваім на дзіва прыгожым, гібкім голасам у выкананні вядомай неапалітанскай песні "Вярніся ў Сарэнта". Вельмі эфектна выглядаў вакальны ансамбль хлопчыкаў з гэтай школы, апранутых у аднолькавыя "мужчынскія" чорныя элегантныя касцюмы.

З нумароў, паказаных школай-каледжам мастацтваў, найбольшае ўражанне пакінуў сваім высокім выканаўчым майстэрствам і прыгажосцю касцюмаў іспанскі танец "Арагонская хота". Як заўсёды, бліснуў сваім валоданнем тэхнікай класічнага танца ансамбль "Харэаграфічныя мініяцюры" Цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Ленінскага раёна, які таксама ўзнагароджаны дыпломам лаўрэата.

Па зразумелых прычынах, усеагульная ўвага публікі і журы была прыкавана да выступленняў самадзейных артыстаў школы-інтэрната для дзяцей, якія слаба чуюць, і дапаможнай школы. Трэба было чуць, як добра, асэнсавана спявалі дзяўчаты з фальклорнага калектыву дапаможнай школы, бачыць, як кранў за душу кожнага з прысутных на канцэрце дуэт вучняў школы-інтэрната для дзяцей, якія слаба чуюць, А. Казаковай і Н. Падалякі, якія сродкамі жэстаў пад фанаграму выканалі песню "Глуханямое каханне". Здавалася, што дзяўчына і юнак спяваюць сэрцамі...

Парадаваў сваёй сыгранасцю і ўзорны аркестр народных інструментаў гарадскога Дома мастацкай творчасці для дзяцей і юнацтва, які ганараваны лаўрэацкага звання.

Пасля канцэрта лепшым выканаўцам былі ўручаны дыпломы і прызы. Намеснік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна У. Ф. Алейнік павіншаваў пераможцаў конкурсу і выказаў думку, што з гэтага часу такія агляды будуць праводзіцца ў далейшым.

Яфім ГЕЙКЕР.

На здымках: *выступае ўзорны хор "Крынічка" школы № 6 з музычна-харавым ухілам; дзюдаісты з клуба "Танрэм".*

Фота А. ФІСЕНКІ.

НА СЦЭНЕ – КРЫМІНАЛЬНАЯ ДРАМА

Дзеянне крымінальнай драмы "Зорка над дахам", пастаўленай па п`есе пецярбургскага драматурга Таццяны Долгавай рэжысёрам і актрысай Ларысай Бархатавай у тэатры драмы і камедыі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча, разгортваецца на паддашку. Менавіта тут знайшоў часовы душэўны прытулак шаснаццацігадовы Хлопчык. Пакрыўджаны бацькамі, ён набыў сабе бясконцы свет сяброў – нябесных зорак, якія атоесамляе з жывымі істотамі і нават размаўляе з імі.

І раптам у чыстае, паэтычнае жыццё Хлопчыка ўрываецца Яна, дзяўчына, пачынаючая наркаманка, якая збегла ад сваіх мучыцеляў – Марго па мянушцы Каралева і закаханага ў яе Гоншчыка, хранічных наркаманаў, якія выкарыстоўвалі трапіўшую ў іх павуцінне дзяўчыну ў якасці жывога тавару для здабывання наркатычных рэчываў.

Уласна кажучы, гэта спектакль у першую чаргу аб сучаснай моладзі, аб страшэннай бядзе, якая пагражае яе здароўю, жыццю. Аднак п'еса звернута і да дарослых, у якіх, як гаворыць Дзяўчына, у грудзях замест сэрца арыфмометр, якія не жадаюць зразумець сваіх дзяцей, абыякавыя да іх унутранага свету, іх сумненняў, хваляванняў, несправядлівыя, няшчырыя – павучаюць аднаму, а на справе робяць зусім іншае.

І гэта прыводзіць да трагедыі, што адбываецца ў спектаклі.

У ім усяго толькі чатыры персанажы, у якіх нават няма імёнаў. Яны і не патрэбныя. Дзеючых асоб граюць маладыя артысты Павел Мікулік (Хлопчык), Ларыса Пакрэўская (Дзяўчына), Таццяна Дарагабед (Каралева) і Андрэй Волчак (Гоншчык). Вельмі ўдалая сцэнаграфія спектакля, ажыццёўленая галоўным мастаком Валерыем Навакоўскім, і музычнае афармленне Сяргея Жыхарава, які дэбютыраваў у гэтай якасці.

Прэм'ера цёпла прынята гледачамі. Вельмі важна, каб яе прагледзела як мага больш бабруйчан, галоўным чынам моладзі.

Г. ЯФІМАЎ.

Віншуем!

За многолетний плодотворный труд и большой личный вклад в возведение социально значимых объектов указом Президента Беларуси Александра Лукашенко директор арендного предприятия "Бобруйский завод крупнопанельного домостроения" **Мария ВИНОКУРОВА** удостоена ордена Почета, а монтажник железобетонных и стальных конструкций **Антон КУНЦЕВИЧ** награжден медалью "За трудовые заслуги".

РАДЫЯЦЫЙНЫ ФОН — У МЕЖАХ НОРМЫ

У апошнія дні ў Бабруйску і іншых рэгіёнах нашай рэспублікі пачалі распаўсюджвацца чуткі аб нібыта рэзкім павелічэнні ўзроўню радыяцыі, прычынай чаму з'явіліся чарговыя непаладкі на Чарнобыльскай АЭС. Наколькі гэта так наш карэспандэнт вырашыў высветліць у галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача горада А.І.ЧЫСТАБАЕВА.

Па словах Андрэя Іванавіча, падобныя чуткі не маюць пад сабой ніякіх падстаў. Да прыкладу, узровень радыяцыйнага фону ў Бабруйску на ўчарашні дзень складаў 8 мікрарэнтген пры дапушчальнай норме – 20 мікрарэнтген. Ніякіх перавышэнняў не было зарэгістравана і ў папярэднія дні.

Абвяргае ўсе падазрэнні аб тым, што нейкая бяда магла здарыцца на атамных станцыях, што размешчаны побач з беларускай мяжой, і начальнік радыяцыйна-аналітычнага аддзела Белгідраметэацэнтра У.Л.Самсонаў. У сваім інтэрв'ю, якое змешчана ў газеце "Звязда" за 20 мая 2000г., Уладзімір Леанідавіч зазначыў:

—На Ігналінскай АЭС стаіць аўтаматызаваная сістэма кантролю, вымярэнні праводзяцца кожныя 10 хвілін, і інфармацыя адразу паступае на нашы камп'ютэры. Каля Чарнобыльскай станцыі пункты радыяцыйнага кантролю знаходзяцца ў Брагіне і Хойніках. У Брагіне, скажам, зараз фон - 86 мікрарэнтген, ён і раней быў такім, можа нават крыху большым, таму што пакрысе ён змяншаецца за кошт распаду цэзію. Таму яшчэ раз паўтаруся – ніякага перавышэння радыяцыйнага фону няма...

А.НІКАЛАЕЎ.

В межрайонном комитете госконтроля

ЛУКОВО-"ЛИПОВЫЙ" СЕРТИФИКАТ КАЧЕСТВА

Сотрудниками Бобруйского межрайонного комитета госконтроля (КГК) Могилевской области за 4 месяца 2000 года проведено 47 проверок предприятий и организаций различных форм собственности. Везде установлены нарушения нормативных актов. Сумма экономических санкций составила 34113,6 тыс. рублей. Почти половина этой суммы взыскана в доход государства. 107 человек привлечены к административной ответственности на сумму 961,25 тыс. рублей. Двое человек освобождены от занимаемой должности, а еще против двух возбуждены уголовные дела.

С интересным фактом столкнулись работники КГК во время проверки АТ "Строительный трест № 13". Это предприятие, как говорится, дышит на ладан. Задержка с выплатой зарплаты затягивается не один месяц. И вместе с тем здесь умудряются строить в долг.

Так, согласно договора за номером 122 от 20.01.1999 г., заключенного между стройтрестом и гражданином Л. на предмет выполнения строительных работ в одном из домов на ул. Чонгарской, строительным трестом в ноябре-декабре прошлого года и январе-феврале текущего года было освоено на указанном доме 3028,9 тыс. рублей (с учетом деноминации). При этом в нарушение п. 14 заказчик не вносил авансы за выполненные работы в денежном выражении или строительными материалами.

Расчет за выполненные работы на сумму 521,3 тыс. рублей заказчик произвел частично 3 февраля 2000 г. строительными материалами (фундаментные блоки в количестве 47 штук и ДСП в количестве 309,75 метров квадратных). В нарушении ст. 9 Закона Республики Беларусь "О сертификации продукции, работ услуг" в сопроводительных документах на строительные материалы, принятые у заказчика, не указаны сведения о нормативных документах по стандартизации, которым должна соответствовать продукция. По вине главного инженера СУ-82 Е. Ф. Ляговича, в должностные обязанности которого входит осуществление контроля за правилами приемки строительных материалов, данные материалы (фундаментные блоки в количестве 47 штук) были приняты без документов подтверждающих соответствие данных материалов требованиям ГОСТ или СТБ. В соответствии с "Перечнем продукции и услуг, подлежащих обязательной сертификации в Республике Беларусь", утвержденным Постановлением Государственного комитета по стандартизации, метрологии и сертификации Республики Беларусь от 16.10.98 г. № 15, фундаментные блоки подлежат обязательной сертификации.

Фундаментные блоки ФБС на сумму 334,0 тыс. рублей, принятые с нарушением установленного законодательством порядка, были перевезены на объект: "Мышковичи, жилой массив"; и из них 26 блоков, на сумму 153,9 тыс. рублей, установлены на объекте, который финансируется за счет средств бюджета, что влечет наложение штрафа на подрядную организацию в размере 100% стоимости реализованной продукции.

При проверке выполненных работ на объекте "Жилой дом на ул. Чонгарской" выявлено, что объем работ произведенный ОАО "Строительный трест № 13" выполнен согласно договорных обязательств, что подтверждается актами. С учетом работ, проведенных в марте на сумму 94,5 тыс. рублей, общая сумма задолженности заказчика составила на 1.04.2000 г., – 3225,6 тыс. рублей, что в пересчете, согласно договорных условий (при несвоевременной оплате заказчиком комплекса работ, оплата их производится по ценам, действующим на момент фактических расчетов) и в соответствии с индексами изменения СМР составляет 3225,6 тыс. рублей. ОАО "Строительный трест № 13" при задолженности по заработной плате: на 1 ноября 1999 г. – 26865 млн. рублей; на 1 декабря 1999 г. – 25522 млн. рублей; на 10 февраля 2000 г. – 12680 млн. рублей, продолжал выполнять работы по строительству жилого дома на ул. Чонгарской без оплаты.

При проверке формирования и применения цен на халву сахарную на АО "Красный пищевик" установлено, что в результате неправильного включения затрат в калькуляции, приведшего к превышению допустимого размера рентабельности на 4,4% на халву сахарную в марте 1999 необоснованно получена выручка в сумме 534 тыс. руб. (с учетом деноминации).

Калькуляции составлялись начальником планового отдела В. И. Шерстневой и утверждалась заместителем директора по экономике Е. М. Титовой.

Нарушение установленного порядка исчисления затрат на АОА "Красный пищевик" установлено повторно в течение года. (Акт проверки отдела цен Бобруйского горисполкома от 22.03.1999).

Сейчас рассматривается вопрос о применении экономических санкций.

Нарушения в вопросах ценообразования установлены и на АО "Завод растительных масел". Доход, полученный в результате превышения предельных индексов изменения отпускных цен (тарифов) на товары при их реализации, составил 13233,9 тыс. рублей.

При проверке Бобруйской районной государственной агрохимической лаборатории установлено, что начальник З. П. Старченко выписала БЗСБ сертификат от 07.04.2000 на лук репчатый в количестве 5200 кг по телефонному звонку товароведа БЗСБ Н. М. Якименко без проведения испытаний, без наличия документов о качестве поставщика, не отбирая образцы, не осматривая партию. Сертификат был выдан директору БЗСБ Л. К. Щедринской.

Начальник агрохимической лаборатории привлечена к административной ответственности на 22 тыс. рублей.

На разные суммы оштрафованы и 30 работников прилавка. Поводом для этого послужили: реализация товаров без наличия сертификатов, антисанитария в торговых и подсобных помещениях, обвесы, сокрытие товаров, реализация просроченных продуктов.

СУХІ ДОЖДЖ... НАД "ВАСІЛЬКОМ"

Вядома, што ў пустынях паветра незвычайна сухое. Дажджавыя кроплі, не дасягаючы зямлі выпарваюцца ў паветры. Мы бачым, як ідзе дождж, знаходзімся пад ім, але не адчуваем яго. Гэта і ёсць сухі дождж. Запэўніваю вас, чытачы, што такая з'ява назіраецца рэгулярна на працягу апошніх пяці гадоў і ў Бабруйску. Канкрэтна, над галовамі калектыву былога атэлье "Васілёк", а зараз фабрыкі па вязцы, пашыву і рамонту трыкатажных вырабаў. Але аб усім па парадку.

Тут у савецкія часіны працавала ажно трыста работнікаў, існавалі два атэлье: "Пушынка" і "Фантазія". Па індывідуальных заказах на любы густ выраблялiся трыкатажныя касцюмы, спадніцы, сукенкі, кофты і іншыя рэчы. У перыяд эканамічнага спаду былое кіраўніцтва прадпрыемства не імкнулася ўтрымліваць асноўную вытворчасць на плыву. Наадварот, з года ў год назіралася яе згортванне. Жылі за кошт здачы памяшкання ў арэнду для навучання беспрацоўных гарадскім Цэнтрам занятасці насельніцтва. Такі малюнак назіраўся ажно да канца мінулага года. За гэты час ад калектыву засталося толькі два дзесяткі работнікаў. Прычына – бяздзейнасць кіраўніцтва фабрыкі, неэфектыўнасць дзяржаўнага кіравання і падтрымкі. Усё гэта і зрабіла схожым калектыў на васілёк, які звянуў, на які падала пустаслоўе і абяцанкі. Як з месца, так і з вобласці.

Трыкатажнікі за гэтыя крызісныя гады назапасілі воз розных даўгоў.

У канцы мінулага года калектыў узначаліў новы кіраўнік Н. Л. Шаова. За кароткі тэрмін змаглі адрамантаваць памяшканне, абсталяванне, набылі новае, запусцілі яго ў вытворчасць. Вярнуліся і ранейшыя спецыялісты, пачалі прымаць заказы ад насельніцтва і ад арганізацый. У калектыве распрацавалі калекцыю сучасных вырабаў.

І як вынік плённай дзейнасці, план па паслугах выкананы з пачатку бягучага года на 135 працэнтаў, прынята 400 заказаў на 1,5 мільёна рублёў. Заключаны з фірмай "Гандальсервіс" дагавор на пашыў швейных вырабаў забяспечвае людзей работай да канца года. Нават з`явілася патрэба ў прыёме вопытных швачак. Сталі завозіць больш тавараў у фірменную краму.

Калектыў фабрыкі стаў набываць зноў свой імідж. Пацвярджэннем гэтаму служыць і запрашэнне да ўдзелу ў міжнароднай выставе-кірмашы "Расія–Беларусь", які праходзіў у Разані. Тут трыкатажнікі "Васілька" (так лічыцца фабрыка ў каталазе) прадэманстравалі 225 адзінак розных сучасных вырабаў. Іх праца ацэнена дыпломам выставы-кірмашу за шырокі асартымент выпускаемай прадукцыі. На кірмашы быў заключан дагавор з некалькімі расійскімі фірмамі на пастаўку бабруйскіх вырабаў.

– Такое здарылася ў гісторыі прадпрыемства ўпершыню, – з гордасцю гаворыць дырэктар фабрыкі Н. Шаова. – Сталі працаваць, як і раней, зноў набылі свой твар. Але баюся, што зноў яго страцім.

З далейшай гутаркі з Нелі Леанідаўнай даведаўся, што калектыў зноў апынуўся ў фінансавым крызісе. Тыя сродкі, што зарабіў калектыў, пайшлі на закупку сыравіны, абсталявання, а таксама на выплату 2,5 мільёна рублёў ранейшых даўгоў. Яшчэ засталося выплаціць 6857 тысяч рублёў старых даўгоў. У цяперашні час заканчваецца пража і вязальшчыцы застануцца без справы.

Больш таго, электрасеткі за невялікі доўг фабрыкі за электраэнергію адключаюць святло. Жанчыны са слязамі на вачах умалялі пачакаць, пакуль уплоцяць запазычанасць па частках. У сваю чаргу кіраўнікі гідролізнага завода, які аказаў дапамогу трыкатажнікам сродкамі, патрабуюць іх вяртання. Ды і абяцаная горадам дапамога для развіцця вытворчасці не аказана да гэтага часу.

Па словах дырэктара Н. Шаовай, выйсце бачыцца ў адтэрміноўцы старых даўгоў. Толькі ў гэтым выпадку калектыў сам зможа выйсці з крызіснай сітуацыі.

М. МАЦВЯЁНАК,
грамадскі карэспандэнт "БЖ".

ГОТОВИМ ТРАНСПОРТ К ТЕХОСМОТРУ

Основными задачами государственного технического осмотра является оценка технического состояния транспортных средств, уточнение их численности, принадлежности и иных регистрационных данных. Один раз в год техническому осмотру подлежат стоящие на балансе предприятий легковые, грузовые, специальные автомобили, мотоциклы, прицепы и полуприцепы. Стоящие на балансе предприятий пассажирские транспортные средства – автобусы, троллейбусы, трамваи, автомобили-такси, специализированные автомобили для перевозки опасных грузов – проходят техосмотр два раза в год. Технический осмотр транспортных средств, принадлежащих предприятиям, проводится в период с 1 января по 31 июля.

Администрации предприятий запрещается изменять сроки проведения техосмотра без согласования с ГАИ, военкоматом и администрацией исполкома. Оплату за проведение техосмотра транспортных средств производят на р/с 3602907410005, код 760, назначение платежа – 04600, покупатель – Государственная налоговая инспекция, филиал 703 в Белбизнесбанке. Оплата за прохождение ТО составляет: для автомобилей – 210 рублей; прицепов, мотоциклов – 80 руб. Транспортное средство, не отвечающее хотя бы одному из требований ПДД, считается неисправным, его эксплуатация запрещается до устранения неисправности и повторного предоставления в ГАИ технического осмотра, а также производится повторная оплата за проведение технического осмотра.

В.СИЛКИН,
госавтоинспектор ГАИ Ленинского РОВД.

АДНАВІЛІ Ў ПАМЯЦІ ПАДЗЕІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

У мінулы чацвер на базе гарадскога Дома афіцэраў была праведзена ваенна-гістарычная канферэнцыя, прысвечаная 55-й гадавіне Перамогі нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі саюз ваенных маракоў горада, гарадское аддзяленне саюза афіцэраў і ГК КПБ.

На канферэнцыі з дакладамі выступілі: палкоўнік у адстаўцы У.І.Аўчыннікаў, капітан III рангу ў адстаўцы І.Ф.Голуб, якія расказалі аб дзеяннях сухапутных войскаў у гады вайны і ролі Ваенна-Марскога Флоту ў дасягненні Перамогі.

У рабоце канферэнцыі прымалі ўдзел і госці — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь С.В.Посахаў, які выступіў перад удзельнікамі з вялікай прамовай, а таксама дэлегацыя ветэранаў дняпроўскай флатыліі, прыехаўшая да нас у Бабруйск з Кіева.

Завяршылася канферэнцыя вялікім канцэртам мастацкай самадзейнасці гарадскіх калектываў.

Валерый ЗІНОЎСКІ.

НЕЛЬЗЯ ЖИТЬ ОДНИМ ДНЕМ

Еще 2500 лет назад в Древней Греции были приняты законы об экологии, за нарушение которых применялись суровые наказания. Но и сегодня находятся люди, безразлично относящиеся к природе, окружающей среде, живущие фактически одним днем. На страже окружающей среды и санитарного порядка в городе стоят сотрудники межрайонного отделения экологического надзора ГАИ УВД горисполкома. Они ежедневно сталкиваются со многими нарушениями Кодекса об административных нарушениях Республики Беларусь.

Так, например, милиционерами отделения только сначала 2000 года было выявлено 100 фактов эксплуатации транспортных средств, у которых содержание загрязняющих веществ в выбросах превышает нормативы, установленные ГОСТом. Хотелось бы напомнить владельцам индивидуальных транспортных средств и водителям государственных автомобилей, что содержание СО в выхлопных газах карбюраторного автомобиля не должно превышать 1,5 процента, а за превышение этого уровня предусмотрен штраф от 0,5 до 3 минимальных заработных плат.

В период с 1 апреля по 15 мая этого года за нарушение правил складирования промышленных и бытовых отходов было составлено 16 административных протоколов, из них 7 на граждан, и 9 – на должностных лиц. Это нарушение влечет наложение штрафа на граждан в размере от 1 до 5 минимальных заработных плат, а на руководителей – от 5 до 50 минимальных заработных плат.

Особо "отличились" в этом нарушении представители таких предприятий и учреждений нашего города, как ЖЭУ-3, ДРСУ-171, ПДРСУ, ГСК-10 и ГСК-18, ГорДЭП, АТЭП-8, ГАП-2, ГорДЭУ, высшего профессионального технического училища декоративно-прикладного искусства.

Большой уровень нарушений приходится и на так называемое загрязнение автомобильных дорог общего пользования. Это перевозка сыпучих грузов без соответствующей упаковки, эксплуатация автомобилей с неисправной системой смазки двигателя и мойка автомобилей на автодорогах общего пользования. Так, С. П. Шуст управлял личным автомобилем, в котором была нарушена герметичность системы смазки двигателя, А. В. Якуш и Т. В. Григорьева осуществляли мойку личного транспорта в неустановленном месте. Всего с начала года за загрязнение дорог был оштрафован 191 водитель.

Хотелось предупредить индивидуальных владельцев грузовых транспортных средств, что в жилой зоне и на дворовых территориях стоянка грузовых автомобилей с разрешенной максимальной массой более 3,5 тонны запрещена и за это нарушение предусмотрен штраф.

Широкое распространение в нашем городе имеет и такое нарушение, как съезд с дороги общего пользования на так называемую зеленую зону. За это предусмотрены штрафные санкции от 0,5 до 3 минимальных заработных плат. Нарушая, вы тем самым повреждаете зеленые насаждения и газоны, эти своеобразные "легкие" нашего города. Сначала года за подобные нарушения 148 человек было подвергнуто административному взысканию.

Граждане, проживающие в частном секторе города, нарушают правила содержания в чистоте улиц и придомовых территорий, за что предусмотрены предупреждения или штраф до 1 минимальной заработной платы. Например, высыпая на проезжую часть золу люди не понимают, что проходящий транспорт разносит в атмосфере вредные вещества, которыми дышим. Всего за апрель и май этого года за подобные нарушения к ответственности было привлечено 17 человек.

Граждане, которые не имеют специальных контейнерных площадок для бытовых отходов, должны заключать договора о вывозе мусора с предприятием "Спецавтотехника", которое осуществляет складирование промышленных и бытовых отходов за пределами города на двух полигонах: в Бабино и Вишневке.

Личный состав межрайонного отделения экологического надзора ГАИ полон решимости и способен решать возложенные на него задачи по оперативному контролю, профилактике и выявлению нарушений. Проблемы экологической безопасности должны затрагивать каждого человека, независимо от его материального и общественного положения. И вместе мы сделаем так, чтобы наша жизнь и наших детей проходила среди чистой, незагрязненной природы.

В. ЗАБЛОЦКИЙ,
майор милиции, начальник МОЭН ГАИ при УВД горисполкома.

ВАШЕ ЗДОРОВЬЕ


ПРЫМАЦЬ НА СЯБЕ ЧУЖЫ БОЛЬ

...Ніхто ад бяды не застрахаваны. Нечакана-негадана ўварвалася яна ў сям'ю Савіцкіх. Іх сын Сяргей, катаючыся на лыжах, атрымаў цяжкую траўму. Трапіў у траўматалагічнае аддзяленне паліклінікі № 1. Яго загадчык Барыс Ягоравіч Шароў зрабіў усё, каб вярнуць хлопчыка да нармальнага жыцця.

Падобных выпадкаў у медыцынскай практыцы доктара Шарова за многія гады работы было, вядома, шмат. У Бабруйск ён трапіў пасля мединстытута. Тры гады працаваў хірургам і неўзабаве быў пераведзены на пасаду загадчыка траўматалагічнага аддзялення. Хутка прайшоў шлях ад простага ардынатара да галоўнага траўматолага горада.

Працаваць даводзіцца шмат: удзень – на прыёме, сутачныя дзяжурствы ў стацыянары, дапамога маладым спецыялістам.

Такі напружаны рытм патрабуе не толькі дасканалых медыцынскіх ведаў, але і добрай фізічнай загартоўкі, псіхалагічнай вытрымкі. Што датычыць умення трымаць сябе ў "пастаяннай баявой гатоўнасці" і аператыўнасці ў крытычнай сітуацыі, каб скараціць час пакут хворага, – усё гэта прыйшло з вопытам. Многім ён абавязаны і старэйшым калегам, напрыклад, галоўнаму хірургу горада В. А. Белагураву, з якім пашчасцівілася працаваць пасля інстытута, шчодра дзяліліся вопытам ураčы-траўматолагі І. С. Цыганкоў, А. Р. Саломенка, А. К. Трухан.



